# ВЯЛІКІЯ ЛІТАРЫ
# ВЯЛІКІЯ МАЛЮНКІ

# ЖЫВЁЛЫ



УДК 087.5:59
ББК 28.6
Ж 94

Пераклад з рускай мовы: *М.В. Адамчык*

Ж 94 **Жывёлы** — Мінск: Харвест, 2018. — 64 с.: мал. — (Самыя вялікія літары. Самыя вялікія малюнкі)

ISBN 978-985-18-4255-7

Падрастаючы, дзеткі штодня даведваюцца пра нешта новае. Асаблівую цікавасць у іх выклікаюць жывёлы, бо яны ж гэткія розныя: вялікія і маленькія, здольныя лётаць і майстры плаваць, адны з іх жывуць у ільдах, іншыя ж насяляюць спякотныя краіны.

Гэта кніга распавядзе вашаму дзіцяці пра шматгранны свет фаўны нашай планеты. Дзіця пазнаёміцца з яе жыхарамі — як з хатнімі жывёламі, якіх, верагодна, яно ўжо бачыла, так і з бясконцым мноствам экзатычных звяроў, што жывуць у розных краінах. На якія групы падзяляюцца ўсе жывыя істоты? Чым яны харчуюцца і дзе жывуць? Як камунікуюць паміж сабой? Якія з іх прыносяць карысць людзям, а якіх належыць асцерагацца? На гэтыя і многія іншыя пытанні маленькі чытач знойдзе тут адказы. Захапляльныя тэксты ў суправаджэнні маляўнічых ілюстрацый, без усялякага сумневу, зацікавяць вашага гарэзу.

УДК 087.5:59
ББК 28.6

**ISBN 978-985-18-4255-7**

© Падрыхтоўка, афармленне, пераклад «Харвест», 2017.

# ЖЫВЁЛЫ — ХТО ГЭТА?

Ты, напэўна, ужо ведаеш такіх жывёл, як сабака і кот, магчыма, ужо бачыў у заапарку льва ці слана, можа быць, у цябе дома жывуць у акварыюме рыбкі. Але ты яшчэ не ўяўляеш, наколькі велізарны і разнастайны ўвесь свет жывёл. Некаторыя з іх распаўсюджаны ў нас, іншыя жывуць вельмі далёка — у спякотных краінах або ў ільдах Антарктыды, адны з'явіліся параўнальна нядаўна, іншыя — вельмі даўно, а нейкія ўжо вымерлі.

Жывёламі прынята называць жывыя істоты, якія дыхаюць, харчуюцца і здольныя рухацца. Навукоўцы падзялілі ўсіх жывёл на дзве вялікія групы: хрыбетныя — рыбы, земнаводныя, рэптыліі, птушкі і млекакормячыя, і бесхрыбетныя — павукі, насякомыя, чарвякі і малюскі.



# Млекакормячыя

Млекакормячыя — гэта жывёлы, у якіх цела пакрытае поўсцю або валасяным покрывам, але галоўнае іх адрозненне ад іншых жывёл у тым, што дзіцянят яны ўскормліваюць малаком. Сёння налічваецца больш за 5000 відаў млекакормячых — гэта каты, сабакі, каровы, сланы, мышы, кіты, людзі і г. д.



**ЛОСЬ** — дастаткова буйное млекакормячае, што жыве ў еўрапейскіх лясах.

**ТАПІР** падобны да свінні, але мае кароткі хобат, прыстасаваны для хапання.





**ФЕНЕК** вонкава нагадвае мініяцюрную лісіцу.





**ЧОРНЫ НАСАРОГ** — млекакормячае даволі ўнушальных памераў. Яго вага дасягае дзвюх тон, а даўжыня цела складае больш за тры метры.

**СЕРНА** — жавальнае млекакормячае, якое жыве ў гарах.



**АФРЫКАНСКІ СЛОН** — самая буйна́я з сучасных наземных жывёл.

# Хатнія жывёлы

Хатнія жывёлы — гэта тыя, якія жывуць з чалавекам і якіх ён утрымлівае, даючы ім прытулак і ежу. Яны могуць утрымлівацца ў адмысловых памяшканнях (стайня, ферма, куратнік і г. д.), але могуць жыць і непасрэдна ў доме чалавека. З тых жывёл, якія жывуць у доме, адных утрымліваюць у клетках, акварыюмах, тэрарыюмах і іншых «хатках», а іншым, напрыклад, коцікам, сабакам, трусікам, дазваляюць свабодна перасоўвацца па памяшканні.

**КОТКА** — хатняя жывёла, якая ловіць мышэй і пацукоў.







**КАРОВА** належыць да свойскай буйной рагатай жывёлы. Жыве яна галоўным чынам на фермах. Вясковыя жыхары маюць кароў ва ўласнай гаспадарцы.

**САБАКА** — адна з найбольш распаўсюджаных жывёл-кампаньёнаў.

**АСЁЛ,** як і конь, патрэбны чалавеку для язды, перавозкі грузаў і для апрацоўкі зямлі.





**БАКТРЫЯН**, або двухгорбы ВЯРБЛЮД, — адна з галоўных хатніх жывёл у многіх раёнах Азіі.

**КОНЬ** — буйная свойская жывёла, што выкарыстоўваецца чалавекам для выканання сельскагаспадарчых работ, для язды і перавозкі грузаў.





**ЛАМА** знешне нечым нагадвае вярблюда, але не мае гарба. Воўна гэтай жывёлы выкарыстоўваецца для вырабу тканінаў.